**І.У.Трыгубка,**
*аспірантка*

# ОПЕРА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVIII ст. НА СЛАВЯНСКІХ ЗЕМЛЯХ ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ АСВЕТНІЦКІХ ІДЭЙ І ТРАДЫЦЫЙ

XVIII стагоддзе — гэта стагоддзе розуму і святла, росквіту навукі і культуры, станаўлення сапраўднай свабоды чалавека. Асветнікі абвясцілі мэтай мастацтва прытрымлівацца прыроды, якая ачысцілася розумам ад уздзеяння цывілізацыі, створанай абсалютысцкім рэжымам, грамадскай няроўнасцю, бяздзейнасцю і багаццем. Героямі твораў літаратуры, тэатра, жывапісу сталі "малыя людзі", не распешчаныя дастаткам і прывілеямі.

Ідэйны рух у XVII—XVIII стст., прадстаўнікі якога прызнавалі вядучую ролю асветы, навукі і тэхнікі, на славянскіх землях атрымаў распаўсюджанне ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст.

У Расіі ў апошняй трэці XVIII ст., у эпоху ўздыму нацыянальнай культуры і асветніцтва, намаганні кампазітараў былі засяроджаны на вядучым жанры – жанры бытавой оперы-камедыі. Камічная опера, што нарадзілася ў нетрах народнага тэатра, выяўляла дэмакратычныя ідэалы Асветніцтва. Думы і надзеі буйнейшых кампазітараў, драматургаў звярталіся да прадстаўнікоў трэцяга саслоўя.

Асобнае месца камічная опера заняла ў культурным жыцці Расіі ў 70-я гг. XVIII ст. Знаёмства з італьянскай, французскай камічнай операй адыграла вялікую ролю, але не магло паслужыць базай нацыянальнага мастацтва. Расіі была патрэбна нацыянальная опера, заснаваная на сваёй літаратурнай традыцыі, на рускай мове і гарадской народнай песеннасці.

Новы жанр камічнай оперы нарадзіўся тады, калі цікавасць да роднага фальклору ўпершыню набыла агульнанацыянальнае значэнне ў рускай культуры. Разам з песенным фальклорам важнай драматургічнай асаблівасцю ранняй камічнай оперы была жывая традыцыя народных гульняў і абрадаў.

Апора на народныя традыцыі поўнасцю адпавядала галоўнай тэме рускай літаратуры гэтага перыяду – тэме абяздоленага сялянства. У першых рускіх операх: "Анюта" Папова, "Разана і Любім" Ніколева і "Мельнік – чарадзей, падманшчык і сват" Аблесімава — закранаецца праблема сацыяльнай няроўнасці, што было характэрна для дэмакратычнага тэатра XVIII ст.

У рускай камічнай оперы, як і ў французскай, пераважаюць народна-бытавыя сюжэты з яркай сацыяльна-выкрывальнай накіраванасцю, пранізаныя ідэяй маральнай перавагі простага чалавека. Гэтыя сюжэты адпавядалі асветніцкім задачам рускага тэатра 70-х гг.

Сярод лепшых бытавых опер таго часу былі "Мельнік – чарадзей, падманшчык і сват", "Як пажываеш, так і праславішся, або Санкт-Пецярбургскі гасцінны двор", "Няшчасце ад карэты", "Скупы", якія адлюстроўвалі рэалістычныя імкненні эпохі.

Асаблівасцю рускай试 опернай драматургіі з'яўлялася яе народна-бытавая тэматыка. Па-рознаму трактуюць карціны быту і нораваў Папоў, Ніколеў, Аблесімаў, Княжнін.

Неабходна вылучыць п'есы, па матывах якія створаны оперы, адзначаныя тэндэнцыяй крытычнага рэалізму. Гэта "Анюта" Папова і "Разана і Любім" Ніколева. У іх ідэя сацыяльнай няроўнасці ўвасабляецца ў драме маладой гераіні, сялянскай дзяўчыны, якая пакутуе ад цяжкіх жыццёвых абставін. Анюта ("Анюта" Папова) кахае маладога двараніна, але не можа звязаць з ім свой лёс з прычыны сацыяльных перашкод. У п'есе "Разана і Любім" прыгонную дзяўчыну праследуе пан, які разлучае яе з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каханым. Але шчаслівая развязка здымае сацыяльны канфлікт.

Трэба адзначыць, што асноўную ролю ў развіцці нацыянальнай оперы таго перыяду адыгралі ўсё ж такі В.Пашкевіч і Е.Фамін. Менавіта яны па праву могуць быць названы стваральнікамі нацыянальнай камічнай оперы.

Оперы В.Пашкевіча "Скупы", "Няшчасце ад карэты", "Як пажывеш, так і праславішся, або Санкт-Пецярбургскі гасцінны двор", "Туніскі паша" ўвайшлі ў лік самых рэпертуарных опер. Трэба адзначыць таксама оперу Е.Фаміна "Амерыканцы".

Менавіта ў другой палове XVIII ст. у Расіі пачынае фарміравацца нацыянальная кампазітарская школа. З'яўляюцца першыя музычныя выданні, зборнікі народных песень, усталёўваецца жанр камічнай оперы, што сведчыць аб росце нацыянальнай самасвядомасці, адлюстраванні ідэй Асветніцтва ў рускай музычнай культуры.

Што тычыцца Беларусі, то тут, як і ў Расіі, на другую палову XVIII ст. прыпадае распаўсюджванне ідэй Асветніцтва, якія прыйшлі з Еўропы. Цэнтрамі культурнага жыцця Беларусі становяцца магнацкія рэзідэнцыі. Цікавай з'явай другой паловы XVIII ст. стаў прыгонны тэатр. Найбольш вядомымі былі прыгонныя тэатры Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку, Слонімскі тэатр Міхала Казіміра Агінскага, Ружанскі – Сапегаў, Гродзенскі – Тызенгаўза. Магнаты запрашалі сюды выдатных майстроў тэатральнага мастацтва з Заходняй Еўропы. Аснову трупы складалі артысты і музыканты з прыгонных сялян і мяшчан.

Музычна-тэатральнае мастацтва Беларусі ў эпоху Асветніцтва развівалася па тых жа законах, па якіх фарміраваўся музычны тэатр Расіі, Польшчы і іншых славянскіх краін. Менавіта ў XVIII ст. нараджаецца нацыянальная оперная драматургія.

З'яўленне оперных твораў на сцэнах прыватнаўласніцкіх тэатраў Беларусі можна аднесці да пачатку XVIII ст. Але першы музычна-сцэнічны твор застаўся безыменным.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На жаль, мы не маем падрабязных звестак аб оперных паказах тых гадоў. Але пра творы гамбургскага кампазітара І.Д.Голанда, запрошанага Радзівіламі ў Нясвіж, гісторыя захавала мноства фактаў. Менавіта тут Голанд стварае шэраг опер у жанры зінгшпіля. Асноўным яго творам лічыцца камічная опера “Агатка, або Прыезд пана” (1784), тэкст якой належыць польскаму драматургу і кампазітару, што жыў у Нясвіжы, Мацею Радзівілу.

Фабула оперы нескладаная. Маладая прыгонная сялянка кахае вясковага хлопца Антака Цалку. Іх шлюбу імкнецца перашкодзіць падстараста Піяшка. Ён хоча выдаць дзяўчыну за Антака Гайдака (усе непаразуменні ўзнікаюць з-за аднолькавасці імён хлопцаў). Ніхто не можа дапамагчы закаханым. Толькі мудры пан, уладальнік вёскі, спыняе Піяшкаву інтрыгу і даруе маладым шчасце: дазваляе дзяўчыне выйсці замуж за Антака, якога яна кахае. Опера завяршаецца ўхваленнем справядлівага пана.

Вуснамі Агаткі аўтар асуджае жорсткасць прыгоннікаў. Опера мае антыпрыгонніцкі характар. Заснаваная на тыповым для таго часу сюжэце, “Агатка” надзвычай арганічна ўпісваецца ў агульнаеўрапейскую культурную плынь. Эпоха Асветніцтва ўвасобілася ў творы ва ўсёй сваёй шматграннасці. Менавіта “Агатка” са сваім выразным профілем, асветніцкімі ідэямі, ухваленнем вясковай прастаты і заклікам да яе шанавання апынулася на вяршыні мастацка-асветніцкай хвалі часу.

Опера “Агатка” — этапны твор у фарміраванні музычна-тэатральнай культуры Беларусі. Менавіта тут адзначылася характэрная для агульнаславянскай культуры тэндэнцыя да збліжэння прафесійнага і народнага мастацтваў.

На словы Мацея Радзівіла была напісана яшчэ адна опера — “Войт сялібы ў Альбе”, але музыка гэтага твора да нашых дзён не захавалася.

Што тычыцца опер, якія ставіліся на сцэнах прыватнаўласніцкіх тэатраў у Слоніме, Гродне, Шклове, трэба

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзначыць, што тут, як і ў іншых славянскіх краінах, відавочна арыентацыя на заходнееўрапейскі рэпертуар. На жаль, аб пастаноўках опер у гэтых тэатрах вельмі мала звестак. Але ўсё ж трэба адзначыць уплыў асветніцкіх ідэй на фарміраванне опернага жанру, які ў гэты час толькі нараджаўся на тэрыторыі Беларусі.

У Польшчы ў другой палове XVIII ст. бяспраўнае становішча і збядненне сялянства, эканамічны і палітычны заняпад краіны, засілле чужаземцаў ва ўсіх галінах культуры не маглі не хваляваць шырокія колы грамадскасці. Ідэі барацьбы за нацыянальную самабытнасць, абарону роднай мовы перапляталіся з матывамі сацыяльнага пратэсту ў перадавых плынях польскага тэатральнага мастацтва, развіццё якога было звязана з развіццём музычнага мастацтва, што стварала перадумовы для пошукаў новых музычна-сцэнічных жанраў.

Трэба адзначыць, што асветнікі XVIII ст. у Польшы, як і ў іншых краінах, адводзілі тэатру выхаваўчыя функцыі, а таму аддавалі перавагу рэпертуару на камедыйныя сюжэты. Францішак Багамолец (1720—1784), беларус па паходжанні, адзін з ініцыятараў стварэння тэатра ў Варшаве, заўважаў, што "...часта адна камедыя можа хутчэй развіць свядомасць чалавека, чым фаліянты маральных навук". У сваіх п'есах, якія з'яўляліся перапрацоўкамі камедый Мальера, Ф.Багамолец уводзіў сцэны, у якіх высмейваліся заганы польскага грамадства, у прыватнасці шляхты. У 1765 г. Ф.Багамолец стварыў і апублікаваў аднаактавую камедыю са спевамі "Ашчасліўленая беднасць". На гэты тэкст была створана опера М.Каменьскага, яе называюць у шматлікіх крыніцах "першай камічнай операй". В.Багуслаўскі перапрацаваў тэкст камедыі Ф.Багамольца ў лібрэта двухактавай камічнай оперы, якая была пакладзена ў аснову твора М.Каменьскага.

Сюжэт оперы быў цесна звязаны з праектамі "сацыяльных рэформаў" Рэчы Паспалітай. Апошні польскі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кароль падтрымліваў мары аб “сацыяльным міры” паміж класамі.

Сюжэт оперы просты. Кася і Антэк кахаюць адзін аднаго і жадаюць ажаніцца. Але маці дзяўчыны лічыць, што дачцэ лепей выйсці замуж за багатага гараджаніна Яна. Мясцовы памешчык, дазнаўшыўся пра гэта, забяспечвае Антэка і Касю ўсім неабходным. У заключэнні оперы ўслаўляецца высакароднасць памешчыка.

Музыка оперы, хаця і не свабодная ад італьянскіх уплываў, пабудавана на народна-бытавой песенна-танцавальнай аснове. Гэта музычна-сцэнічны твор на роднай мове і на сюжэт з жыцця народа.

Трэба адзначыць, што творчасць М.Каменьскага, славака па паходжанні, садзейнічала дэмакратызацыі польскага музычна-тэатральнага мастацтва, вызначала шляхі яго самабытнага развіцця.

Другая палова XVIII ст. была цяжкім перыядам і для чэшскага народа. Тыранія Габсбургаў прымусіла многіх чэхаў пакінуць радзіму. У гэты час ганенне на славянскую культуру дасягнула апагея: афіцыйнай мовай была аб’яўлена нямецкая. Але перадавыя колы чэшскай грамадскасці вялі барацьбу за родную мову. Разам з барацьбой за сацыяльнае вызваленне развіваўся патрыятычна-асветніцкі рух. Галоўнае месца ў ім адводзілася барацьбе за нацыянальную літаратурную мову і чэшскі тэатр, які займаў цэнтральнае месца ў грамадскім жыцці Чэхіі.

Узнікненне чэшскай опернай класікі звязана з шасцідзесятымі гадамі XIX ст. Але нельга не адзначыць ролі чэшскай музыкі XVIII ст. Вялікае значэнне для развіцця еўрапейскага опернага мастацтва мелі зінгшпілі і меладрамы Йірджы Бэнды (1722—1795), які быў прадстаўніком чэшскай “музычнай міграцыі”. Паслядоўнік французскіх асветнікаў, ён садзейнічаў дэмакратызацыі опернага жанру. Драматычны талент кампазітара раскрыўся ў яго меладрамах “Арыядна на Наксасе”, “Медэя”. Нягледзячы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на ўплыў на творчасць Й.Бэнды замежных культур, ён заставаўся чэшскім кампазітарам, які не губляў сувязей з крыніцамі айчыннай культуры і развіваў у сваёй творчасці нацыянальныя рысы. Кампазітар разумеў неабходнасць дэмакратызацыі опернага мастацтва. У 1776 г. быў пастаўлены яго “Вясковы кірмаш” — першая опера, прысвечаная быту сяла. Менавіта гэты твор музыказнаўцы называюць папярэднікам “Прададзенай нявесты” Б.Сметаны.У оперы гучаць народнапесенныя і танцавальныя інтанацыі, характэрныя для чэшскага народа. Але ж тут яшчэ адсутнічаюць тыя рэалістычныя колеры, якімі Б.Сметана намалюе чэшскае сяло і яго жыхароў. Аднак творчыя дасягненні і рэформы Й.Бэнды адыгралі значную ролю ў развіцці чэшскага музычнага тэатра.

Неабходна адзначыць, што сюжэт першай французскай камічнай оперы “Вясковы чарадзей” Жан Жака Русо (1752) стаў папулярным у эпоху Асветніцтва і на славянскіх землях. Аб гэтым сведчаць такія оперы, як “Вясковы кірмаш” Й.Бэнды (1776), “Ашчаслівленая беднасць” М.Каменьскага (1778), “Мельнік – чарадзей, падманшчык і сват” М.Сакалоўскага (1779), “Агатка” І.Голанда (1784).

Такім чынам, асветніцкія ідэі на славянскіх землях ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст. (на тэрыторыі Расіі, Беларусі, Польшчы, Чэхіі і іншых краін) былі звязаны перш за ўсё з ростам нацыянальнай самасвядомасці, чым і абумоўлена павышаная цікавасць да айчыннай гісторыі, мовы, народнай культуры. Менавіта ў гэты перыяд у музычна-тэатральным мастацтве (асабліва ў оперы) найбольш яскрава былі адлюстраваны ідэі Асветніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ